# МАЛАДЫ КІРАЎНІК



Павел Міхайлавіч Сапоцька нарадзіўся 4 студзеня 1992 года ў г. Маладзечне.

Ягоны сваяк, ксёндз Міхал Сапоцька (1888-1975 гг.) жыў у горадзе Беластоку. Матуля - Алена Уладзіміраўна 1963 г.н. па адукацыі метролаг (закончыла політэхнічны каледж у г. Маладзечне). Яго бабуля Галіна Іванаўна 1939 г.н. Тата - Міхаіл Станіслававіч 1965 г.н. па адукацыі будаўнік (закончыў будаўнічую вучэльню). У сферу культуры Павел пайшоў у сям'і першым.

У 1998 годе пайшоў у школу, якую закончыў ў 2009 годзе і паступіў ва Універсітэт культуры і мастацтваў на кафедру "Менеджмент сацыяльна-культурнай сферы". Практыку праходзіў у Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь.

У школе беларускай мовай зацікавіўся праз творчасць Васіля Жуковіча, калі быў на ягоным творчым вечары. Спадар Павел любіць збіраць аўтографы вядомых людзей. Сяргей Панізнік, Анатоль Бутэвіч, Васіль Жуковіч, Эдуард Ханок пакінулі подпісы ў яго ў нататніку.

У 2011- 2012 спадар Павел працаваў спецыялістам па сувязях з грамадскасцю ў "Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва". Старшыня праўлення Менскага абласнога аддзялення грамадскага аб'яднання "Беларускі фонд культуры", намеснік старшыні Дабрачыннага фонда "Спадчына Міхала Клефаса Агінскага". Удзельнік больш за 50 навукова-практычных канферэнцый і аўтар больш, чым 150 артыкулаў у друкаваных і электронных сродках масавай інфармацыі.

Узнагароджаны дыпломам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, граматай Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, дзвюмя ганаровымі граматамі Беларускай праваслаўнай царквы, ганаровай граматай Беларускага саюза кампазітараў, падзякай рэктара Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта, падзякай старшыні Маладзечанскага раённага выканаўчага камітэта, падзякай мэра Рэтаўскага самакіравання (Літва), падзякай рэктара Гжэльскага дзяржаўнага ўніверсітэта (Расія), падзякай старшыні прэзідыума Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва, падзякай амбасады Эстонскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь, ганаровай граматай дабрачыннага фонду "Спадчына Міхала Клефаса Агінскага", ганаровай граматай гістарычна-культурнага фонду "Ляліва", ганаровай граматай менскага сходу нашчадкаў шляхты, падзякай прадусарскага цэнтра "JAZZ in MINSK", дыпломам Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

У 2014 годзе спадар Павел стаў пераможцам ў намінацыі "Арганізатар года", а ў 2015 годзе - пераможцам у намінацыі "Творчая асоба года"...

Трэба адзначыць, што магістр культуралогіі Павел Сапоцька паступіў у аспірантуру! Тэма дысертацыі "Рэпрэзентацыя гістарычна-культурнай спадчыны Беларусі сацыяльна-культурнымі рэкламістамі". Кіраўнік працы - Аляксандр Іванавіч Смолік.

З 1 верасня 2015 года Павел Міхайлавіч Сапоцька стаў дырэктарам галерэі "Універсітэт культуры".

За гэты час адкрыта больш за 20 выстаў. Акрамя гэтага малады кіраўнік выкладае ўжо два гады на кафедры міжкультурных камунікацый роднай навучальнай установы!

24 красавіка 2015 года спадар Павел ажаніўся. Жонка Кацярына, 1994 года нараджэння, таксама нарадзілася ў г. Маладзечне. Атрымала адукацыю ў Берасцейскім дзяржаўным універсітэце імя А.С. Пушкіна.

Спадар Павел наведаў многія краіны (Украіну, Расію, Чэхію, Аўстрыю, Германію, Швецыю, Егіпет, Францыю, Нідэрланды, Латвію, Літву, Славакію і іншыя краіны), але кожны тыдзень бывае ў родным горадзе Маладзечне!

Павел Міхайлавіч марыць зрабіць вялікі ўнёсак у захаванне культурнай спадчыны Беларусі, у развіццё беларускай культуры. Мае ў думках шмат цікавых культурніцкіх праектаў і вялікае жаданне іх рэалізацыі!

***Аляксей Шалахоўскі,***
*гісторык культуры.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ